# Фарміраванне ў навучэнцаў педвучылішча ўменні канструяваць гіпотэзы

В. І. Мітраш

Адным з уменняў, якое дазваляе педагогу канструктыўна і творча падыйсці да рашэння ўзнікаючых у працэсе яго прафесійнай дзейнасці педагагічных задач, з’яўляецца ўменне вылучаць гіпотэзы. Аднак, як паказваюць матэрыялы нашага канстатуючага эксперымента, нават выпускнікам педвучылішча цяжкавата вылучыць прасцейшыя гіпотэзы. З мэтай фарміравання гэтага даволі складанага даследчыцкага ўмення ў нашай доследна-педагагічнай працы былі выкарыстаны:

1. Вучэбныя педагагічныя задачы. Адным з кампанентаў працэдуры іх рашэння з’яўлялася фармуляванне гіпотэзы.
2. Спецыяльныя заданні ў пабудове і аналізе гіпотэз на аснове прапанаваных педагагічных сітуацый.
3. Задачы, якія прадугледжваюць альтэрнатыўныя ці шматлікія варыянты рашэнняў, дзе выбар найбольш аптымальнага падаваўся на аснове ацэнак таго ці іншага варыянта.
4. Заданні дыягнастычнага характару. Асновай для выпрацоўкі з’яўляўся матэрыял, атрыманы самімі навучэнцамі ў выніку выкарыстання дыягнастычных методык.

Спынімся падрабязней на апошнім тыпе заданняў. Для іх выканання навучэнцы былі аб’яднаны ў групы па 5-6 чалавек, прычым кожная з іх атрымала сваю тэму дыягнастычнай работы. Практыкавалася фарміраванне змешаных груп, дзе аднолькавае заданне выконвалі навучэнцы з розным ўзроўнем сфарміраванасці даследчыцкіх уменняў. Планавалася, каб усе навучэнцы, якія атрымалі адну і тую ж тэму, працавалі ў розных класах, у розных настаўнікаў, чым дасягалася б накапленне няроўназначных даных.

Праца па вылучэнні гіпотэз на аснове атрыманага дыягнастычнага матэрыялу ўключала:

1) самастойны аналіз кожным навучэнцам сабраных даных;
2) групавое абмеркаванне, абагульненне і раздзяленне даных;
3) вылучэнне гіпотэзы ў падгрупе;
4) калектыўная выпрацоўка і абгрунтаванне гіпотэзы.

На розных этапах даследчыцкай работы па вылучэнні гіпотэз наглядалася супрацоўніцтва выкладчыка з навучэнцамі. І гэта не толькі частковая дапамога пры зборы даных, іх апрацоўцы, падвядзенні вынікаў (што характэрна ў адносінах да навучэнцаў з нізкім ўзроўнем сфарміраваных ўменняў), але і сумеснае абмеркаванне гіпотэз ў мікрагрупах. Намі выкарыстоўвалася і такая форма супрацоўніцтва, калі выкладчык атрымоўваў магчымасць інтэрпрэтыраваць у гутарцы са школьнікамі і настаўнікамі здабытыя навучэнцамі даныя. Разам з тым, і сам навучэнец-даследчык меў магчымасць давесці вынікі сваёй працы таварышам. У шэрагу выпадкаў з мэтай праверкі, пацвярджэння ці адмаўлення вылучаных гіпотэз была арганізавана таксама была арганізавана эксперыментальная дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучэнцаў з выкарыстаннем розных метадаў даследавання, а на базе глыбокага вывучэння праблемы ішло напісанне курсавой работы.

У сітуацыі сумеснага пошуку і выпрацоўкі гіпотэз на аснове дыягнастычнага матэрыялу расло асэнсаванне навучэнцамі каштоўнасці самастойнага вывучэння навучэнцамі педагагічнага працэсу, што прыводзіла не толькі да авалодання даным даследчыцкім уменнем, але і да разумення сутнасці даследчыцкай дзейнасці, фарміравання правільнай устаноўкі на такую дзейнасць. Частка навучэнцаў працавала не толькі са сваім практычным матэрыялам, але звярталася да літаратурных крыніц для азнаямлення з поглядамі вучоных па тым ці іншым пытанні.

Дыягнастычныя заданні ўяўляюць каштоўнасць не толькі таму, што складаюць аснову для калектыўнага абмеркавання і абгрунтавання гіпотэз. Даследуючы асобныя фрагменты педагагічнага працэсу, навучэнцы непасрэдна набліжаюцца да вывучэння і аналізу педагагічнага вопыту і выпрацоўваюць неабходныя ўменні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ